Лабанок Уладзімір Елісеевіч

Лабанок Уладзімір Елісеевіч—старшыня выканкома Гомельскага абласнога Совета дэпутатаў працоўных—кандыдат у дэпутаты Совета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР па Мазырскай сельскай выбарчай акрузе № 73.

Лабанок Уладзімір Елісеевіч нарадзіўся ў 1907 годзе ў сям'і селяніна вёскі Астраў Рудзенскага раёна Мінскай вобласці. Член КПСС з 1930 года.

Сваю працоўную дзейнасць тав. Лабанок У. Е. пачаў у сельскай гаспадарцы бацькоў. У 1923 годзе ён паступіў у Мар'іна-Горскі сельскагаспадарчы тэхнікум. У 1931 годзе скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. Пасля заканчэння акадэміі працаваў аграномам Наркамзема БССР і адзін год вучыўся ў аспірантуры Інстытута [illegible] сельскай гаспадаркі.

З 1933 года працаваў аграномам Наркамата соўгасаў БССР, а з 1934 года—дырэктарам Беліцкага, потым Смальянскага сельскагаспадарчых тэхнікумаў у Віцебскай вобласці.

У 1941 годзе тав. Лабанок У. Е. быў вылучан на партыйную работу—сакратаром Лепельскага райкома КП(б)Б. У гады Вялікай Айчыннай вайны ён узначальваў Лепельскі падпольны райком партыі і камандаваў партызанскай брыгадай, потым злучэннем партызанскіх брыгад у тылу нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Пасля выгнання нямецка-фашысцкіх акупантаў з беларускай зямлі тав. Лабанок У. Е. працаваў намеснікам загадчыка сельскагаспадарчага аддзела ЦК КП(б)Б. З 1944 да 1946 года ён быў старшынёй выканаўчага камітэта Полацкага абласнога Совета дэпутатаў працоўных.

У 1946 годзе тав. Лабанок У. Е. быў выбран другім сакратаром, а ў 1948 годзе — першым сакратаром Палескага абласнога камітэта КП(б)Б. Цяпер тав. Лабанок У. Е. працуе старшынёй выканкома Гомельскага абласнога Совета дэпутатаў працоўных.

За заслугі перад Радзімай у гады Вялікай Айчыннай [illegible] праяўлены ў барацьбе [illegible] з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, Савецкі ўрад прысвоіў тав. Лабанку У. Е. званне Героя Савецкага Саюза з уручэннем ордэна Леніна і медаля «Залатая Звязда», узнагародзіў яго ордэнамі: Леніна, Чырвонага Сцяга, Суворава I ступені, Айчыннай вайны I ступені і чатырма медалямі.

Тав. Лабанок У. Е. з'яўляецца дэпутатам Вярхоўнага Совета СССР трэцяга склікання, дэпутатам Вярхоўнага Совета БССР, членам Цэнтральнага Камітэта КП Беларусі.

ПРЕЗИДЕНТСКАЯ БИБЛИОТЕКА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ